# Каля Гродна, на былой граніцы

**У адным з сучасных мікрараёнаў старадаўняга Гродна ўзвышаецца велічны помнік, прысвечаны пагранічнікам, якія гераічна абаранялі рубяжы савецкай краіны ў першы дзень Вялікай Айчыннай вайны. Мемарыял «Граніца» – даніна нашай памяці вядомым і невядомым ахоўнікам дзяржаўнай мяжы, тым, хто чэрвеньскім золакам далёкага 1941 года адважна прыняў на сябе ўдар значна пераўвышаючых сіл ворага і пры гэтым выканаў свой абавязак па абароне Радзімы да канца.**

Перадваенную гісторыю Гродна нельга адасобіць ад перыпетый германа-савецкіх адносін другой паловы 1939 года. Пасля таго як Германія ў першы восеньскі дзень 1939-га сваім вераломным нападам на Польшчу распачала Другую сусветную вайну, а Савецкі Саюз на працягу 17–29 верасня ажыццявіў вызваленчы паход у Заходнюю Беларусь, Германія і СССР сталі суседзямі і нават у працяг заключанага раней так званага «Пакта Молатава – Рыбентропа» падпісалі Дагавор аб дружбе і граніцы. Згодна з ім мяжа ўстанаўлівалася на беларускім напрамку па рэках Заходні Буг, Нараў і далей па дэмаркацыйнай лініі, што, апаясваючы і пакідаючы на савецкай тэрыторыі такія буйныя гарады, як Ломжа, Граева, Аўгустоў, амаль ушчыльную набліжалася да Гродна, які ў адзін момант стаў прыгранічным горадам.

## Новая граніца

Плошча Беларускай ССР, якая ўваходзіла тады ў склад Савецкага Саюза, павялічылася амаль удвая (ёй былі вернуты землі з пераважна беларускім насельніцтвам, што ў 1921 годзе паводле ўмоў Рыжскага мірнага дагавора дасталіся Польшчы), і СССР стаў уладкоўваць сваю новую мяжу. У даволі сціслыя тэрміны на яе беларускім участку з'явіліся чатыры пагранічныя атрады: 86-ы, штаб якога знаходзіўся ў горадзе Аўгустоў, 87-ы – у г. Ломжы, 88-ы з цэнтрам спачатку ў г. Чыжаў, а пасля ў мястэчку Шапятова і 17-ы са штабам у г. Брэсце. За кожным з іх быў замацаваны адрэзак працягласцю да 128 км. Пагранатрады складаліся з некалькіх падраздзяленняў, ніжэйшымі па рангу сярод якіх былі лінейныя заставы з зонай адказнасці па ахове 8-кіламетровага ўчастка дзяржаўнай мяжы.

Хоць працэс фарміравання новых пагранатрадаў Беларускай пагранічнай акругі праходзіў па стандартных загадзя распрацаваных інструкцыях, часам узнікалі пэўныя няўвязкі і складанасці. Напрыклад, пры камплектаванні штатаў падраздзяленняў, размяшчэнні інфраструктуры і г.д. Але гэта не адбівалася на агульнай гатоўнасці савецкіх пагранічнікаў выконваць свае абавязкі па ахове дзяржаўнай мяжы.

Між тым літаральна з першых дзён на памежжы было неспакойна. Нягледзячы на падпісаны паміж СССР і Германіяй дагавор, з боку апошняй даволі часта ўчыняліся правакацыі. У прыватнасці, на беларускім участку было выяўлена 219 фактаў пераходу мяжы з нямецкага боку ў кастрычніку – снежні 1939 года і амаль столькі ж – 218 – у студзені 1940 года. Прычым у далейшым назіраўся толькі рост іх колькасці.

Паводле сцвярджання гісторыка пагранічнай службы Леаніда Спаткая, які на падставе архіўных крыніц зрабіў спробу сістэматызацыі фактаў парушэння германа-савецкай мяжы на беларускім яе ўчастку ў перадваенны час, агульная абстаноўка там была напружанай. Вось толькі некалькі прыкладаў з данясенняў камандавання 86-га Аўгустоўскага пагранатрада: «5 ноября 1940 г. пограничным нарядом были задержаны два нарушителя, которые были завербованы отделением гестапо г. Сувалки и переправлены через границу с заданием установить состав гарнизона РККА в г. Белосток»; «Ночью 8 ноября 1940 г. инструктор службы собак Бугаев несколько

километров преследовал нарушителя границы, который произвел по пограничнику восемь пистолетных выстрелов. Бугаев настиг нарушителя и уничтожил его выстрелом из револьвера. У убитого обнаружены пистолет, 24 патрона, гранаты, шпионские материалы»; «19 ноября 1940 г. пограничники Карпов и Пахотенко вступили в бой с тремя нарушителями, вооруженными револьверами и гранатами, и уничтожили их; в этот же день в 23.50 на участке 7-й заставы пограничным нарядом были обнаружены на КСП (кантрольнай следавой паласе. – *С.Г.*) следы девяти человек, ведущие в наш тыл. Комендант участка капитан Мягкий немедленно доложил об этом начальнику отряда и выехал на место происшествия для организации преследования. Начальник отряда майор Здорный перекрыл вероятные пути движения нарушителей двумя группами пограничников»; «Одна из групп под командованием старшего лейтенанта Царепко на другой день в 7.00 задержала трех вооруженных нарушителей, изъяв у них два револьвера и две гранаты «Мильса». В 13.00 группа под командованием техника-интенданта 1-го ранга Романенко уничтожила еще одного вооруженного нарушителя…»; «30 ноября на участке отряда было задержано пять нарушителей, у которых были два пистолета, 26 боевых патронов к ним, две гранаты, советские и германские деньги».

Гэтыя і шматлікія іншыя факты незаконнага перасячэння мяжы сведчылі аб тым, што фашысты рыхтаваліся да ваеннага процістаяння з СССР загадзя. Засылаючы на савецкую тэрыторыю перабежчыкаў, яны імкнуліся выведаць месца дыслакацыі асноўных падраздзяленняў свайго будучага праціўніка, іх структуру, узброенасць і г.д., аб чым і сведчылі на допытах самі парушальнікі граніцы.

## Напярэдадні

У маі – першай палове чэрвеня 1941 года пачасціліся выпадкі затрымання спецыяльна падрыхтаваных дыверсійных груп пры спробе перасячэння мяжы. Так, затрыманыя 17 чэрвеня на ўчастку 86-га Аўгустоўскага пагранатрада «нарушители границы Станкевич Ярослав Иосифович, Точеловский Болеслав Янович, Якимчиц Станислав Болеславович, Зелинский Болеслав Янович, Волосевич Станислав Казимирович показали, что с 10 по 13 июня они обучались в г. Ламсдорф (район Берлина) на специальных курсах агентов-диверсантов. Всего на курсах обучалось 50 человек, которые также в ближайшие дни должны быть выброшены на территорию Советского Союза. Два агента уже выехали 16 июня… с задачей перейти на территорию СССР для совершения диверсионного акта в окрестностях г. Лунинец. Допросом диверсантов установлено, что германская разведка стремится к началу военных действий между Германией и СССР отрезать передвижение частей Красной Армии по железным дорогам, для чего провести диверсии на следующих стратегических пунктах: диверсантам Волосевичу и Зелинскому дано задание взорвать железнодорожное полотно на перегоне Столбцы – Барановичи (близ д. Осиповщина); Станкевичу и Якимчицу – взорвать железнодорожное полотно на перегоне Лида – Молодечно (в районе ст. Гавья); Точеловскому – провести эти же диверсионные акты в районе ст. Лунинец…».



▲ Пагранічнікі заставы № 1 86-га Аўгустоўскага пагранатрада. Фота 1940 года

Зразумела, што аб усіх такіх выпадках камандаванне пагранатрадаў неадкладна дакладвала ў штаб Беларускай пагранічнай акругі, адкуль адпаведныя даясенні накіроўваліся ў Маскву. Такія ж паведамленні паступалі кіраўніцтву краіны і з іншых участкаў заходняй мяжы СССР. Вядома ж, трэба было прымаць канкрэтныя меры. І гэта рабілася, але з пэўнай аглядкай.

З аднаго боку, савецкае ваенна-палітычнае кіраўніцтва рабіла захады па ўзмацненні пагранічнага кантролю на мяжы – уводзіліся дадатковыя штаты, выдзялялася больш зброі і боепрыпасаў, праводзілася шырокая ідэалагічная работа з асабовым складам пагранзастаў і г.д. А з другога – рабілася ўсё магчымае, каб пазбегнуць уцягвання савецкіх узброеных сіл у правакацыі, што арганізоўвалі фашысты на граніцы. Прынамсі, не жадаючы даваць падставы Германіі апраўдаць перад міжнароднай супольнасцю свой магчымы напад на Савецкі Саюз вымушанай абаронай, была зроблена стаўка на гэтак званую бесканфліктную тактыку добрасуседства. Менавіта таму ў загадах, што спускаліся савецкім пагранічнікам зверху, уводзіліся абмежаванні на выкарыстанне зброі супраць перабежчыкаў – забаранялася весці агонь у бок граніцы, каб выключыць пападанне куль на сумежную тэрыторыю, таксама была накладзена забарона на знішчэнне нямецкіх самалётаў, якія перасякалі германа-савецкую мяжу. Акрамя гэтага, звярталася ўвага камандавання пагранатрадаў на безумоўнае выкананне заключанай 10 чэрвеня 1940 года міністэрствамі замежных спраў СССР і Германіі канвенцыі «Аб парадку рэгулявання пагранічных канфліктаў і інцыдэнтаў».

А між тым асобныя палажэнні гэтага дакумента відавочна супярэчылі ўмовам вядзення надзейнага пагранічнага кантролю. Прынамсі, прадугледжвалася, што «в случаях нарушения линии границы должностными лицами той или другой стороны назначается расследование и, если будет установлено, что переход (перелет) границы был неумышленным (потеря ориентировки, неисправность материальной части, полная выработка топлива и т.д.), то перешедшее (перелетевшее) лицо подлежит немедленному возвращению». Дарэчы, германскі бок вельмі паспяхова выкарыстоўваў менавіта гэтае палажэнне канвенцыі ў сваіх мэтах – пад маркай страты арыентацыі нямецкія самалёты-разведчыкі не толькі заляталі на савецкую тэрыторыю, але і з-за «нечаканых паломак» часта ажыццяўлялі пасадкі на недалёкіх ад граніцы аэрадромах. Затым пасля «рамонту» і на падставе рашэння камісіі, што разглядала факты нібыта экстраннай пасадкі, яны без усялякіх праблем вярталіся ў Германію. Палажэннямі канвенцыі актыўна карысталіся і многія нямецкія разведчыкі, якія пераходзілі граніцу СССР наземным шляхам.

## На пазіцыях

– З чатырох пагранічных падраздзяленняў, якія неслі службу па ахове мяжы з Германіяй на яе беларускім участку, непасрэдна на сучаснай тэрыторыі Беларусі размяшчалася некалькі лінейных застаў 86-га Аўгустоўскага і 17-га Чырванасцяжнага Брэсцкага пагранатрадаў, – расказвае Андрэй Вашкевіч, загадчык аддзела найноўшай гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. – Такое несупадзенне з існуючым зараз беларуска-польскім міждзяржаўным размежаваннем тлумачыцца тым, што ў верасні 1944 года Савецкі Саюз перадаў Польшчы большую частку Беластоцкай вобласці і некалькі раёнаў, што ўваходзілі ў склад даваеннай Брэстчыны, пасля чаго новая мяжа пралягла па зусім іншых мясцовасцях.

Увогуле ж за два няпоўныя перадваенныя гады нясення службы пагранічнікі, якія ахоўвалі савецка-германскую мяжу, добра-такі прызвычаіліся да частых правакацый з нямецкага боку. Але гэта акалічнасць не паўплывала на іх агульную гатоўнасць абараніць мяжу сваёй краіны ў першыя хвіліны і гадзіны Вялікай Айчыннай вайны. Даволі хутка ўсвядоміўшы, што дзеянні фашыстаў у самую кароткую ноч года зусім не з'яўляюцца бяскрыўдным інцыдэнтам, дазорцы Беларускай пагранічнай акругі без ваганняў уступілі ў няроўную схватку з ворагам…

Як вынікае з успамінаў начальніка 86-га Аўгустоўскага пагранічнага атрада Гурыя Здорнага, яшчэ а 2-й гадзіне ночы 22 чэрвеня на ўчастку 6-й і 7-й застаў праціўнік распачаў спробу захапіць у палон дазорныя нарады. Але каля паўтара дзясятка нямецкіх салдат, што ўварваліся на савецкую зямлю, пад агнём савецкіх пагранічнікаў мусілі вярнуцца на сумежную тэрыторыю. У гэты ж самы час на ўчастку 11-й пагранзаставы былі абясшкоджаны яшчэ два дыверсанты. Звесткі пра падобныя здарэнні сталі паступаць і з іншых застаў. Таму, улічваючы цяжкасць становішча, увесь асабовы склад Аўгустоўскага пагранатрада быў падняты па трывозе з заняццем акопаў і іншых інжынерных збудаванняў: яны меліся на кожным падраздзяленні для кругавой аба-

роны. А калі праз паўтары гадзіны пачуўся гул самалётаў, што скіраваліся ў бок Гродна, і пачаўся артылерыйскі абстрэл, пасля яго пайшла ў наступленне пяхота, стала відавочна, што гэта не чарговая памежная правакацыя немцаў, а вайна, пра пачатак якой менавіта ў ноч на 22 чэрвеня неаднаразова папярэджвалі перабежчыкі.

## Застава Усава

«Силы противника сосредоточились на трех направлениях: первое направление – против участка нашей первой заставы вдоль шоссе Сарны – Сопоцкин – Гродно; второе направление – против участков 5, 6, 7 и 8-й пограничных застав, на фронте 20–25 километров здесь сосредоточилась самая крупная группировка танковых и механизированных частей противника; это направление обеспечивало противнику выход к шоссе Августов – Гродно, проходившему в 3–10 километрах от государственной границы; третье направление – против участков 18-й и 19-й пограничных застав в направлении шоссейной и железной дорог Кенигсберг – Граево – Белосток», – чытаем далей успаміны Г. Здорнага.

У сваіх планах па нападу на СССР прагматычныя немцы адводзілі ўсяго каля паўгадзіны часу на пераадоленне савецкіх памежных застаў. Яны добра ведалі, што «86-й погранотряд, как и другие части пограничных войск, имел на вооружении лишь винтовки, ручные и станковые пулеметы, гранаты и небольшое количество автоматов», таму і не спадзяваліся на сур'ёзнае супраціўленне пагранічнікаў. Між тым якраз у гэтым і быў першы пралік рэалізацыі іх бліцкрыгу на ўсходзе.

І ўсё ж, нягледзячы на прынятыя камандзірам 86-га Аўгустоўскага атрада экстранныя меры па наладжванні адпору ворагу, многія пагранічныя падраздзяленні апынуліся ў няпростым становішчы: сярод іх і 1-я камендатура, у якую ўваходзілі найбліжэй размешчаныя да Гродна 1, 2, 3 і 4-я пагранзаставы. Іх абаронцам давялося весці бой са значна большымі колькасна сіламі праціўніка, без якой-небудзь падтрымкі і сувязі.

У выключна цяжкім становішчы апынуліся пагранічнікі 3-й заставы, якой камандаваў лейтэнант Віктар Усаў. Размяшчалася яна ў былым манастыры Юзафатава каля вёскі Вулька Даргунская, за 7 км на захад ад пасёлка Сапоцкін. Яе штат налічваў 30 чалавек – два стралковыя, адно кулямётнае аддзяленне і аддзяленне кіналагічнай службы. На ўзбраенні былі толькі вінтоўкі, два ручныя і адзін станковы кулямёты.




Як толькі вораг адкрыў агонь па дазорных нарадах, камандзір заставы аддаў загад астатнім пагранічнікам заняць месцы ва ўмацаваннях апорнага пункта. Першае стралковае аддзяленне на чале з лейтэнантам Віктарам Усавым прыкрывала падыход да заставы з захаду і паўднёвага захаду, другое, якое ўзначальваў палітрук Аляксандр (Шаіх) Шарыпаў, заняло абарону з поўначы і паўночнага захаду. Ручныя кулямёты былі ўстаноўлены на флангах аддзяленняў, разлік станковага кулямёта размясціўся на гарышчы стайні. Не прайшло і некалькі хвілін, як паказаліся немцы. Яны добра ведалі размяшчэнне савецкіх абарончых умацаванняў, таму, раздзяліўшыся на дзве групы – першая колькасцю да роты, другая – да ўзвода, павялі адначасовы штурм. Калі да захопнікаў заставалася 300 метраў, пагранічнікі па камандзе Усава адкрылі агонь. А як толькі «загаварылі» кулямёты на флангах, праціўнік вымушаны быў спыніцца для перагрупіроўкі.

Праз некаторы час немцы зноў перайшлі ў наступленне. Праўда, на гэты раз яны ўжо скарысталі для свайго прыкрыцця бронетранспарцёр. Тут жа ад камандзіра В. Усава паступіў загад знішчыць варожую тэхніку. Аднак дасягнуць мэты радавому М. Фацюшкіну не ўдалося: звязка гранат, што ён кінуў, не падбіла бронетранспарцёр. Тым не менш ужо сама дзёрзкая спроба падарваць машыну, на якую праціўнік, відаць, асабліва разлічваў у вядзенні зусім іншага бою і ў іншым месцы, але толькі не на заставе, вымусіла вадзіцеля падумаць пра яе захаванасць, і ён вярнуўся на сумежную тэрыторыю. Пасля гэтага немцы, для якіх стала нечаканым упартае супраціўленне, зрабілі яшчэ некалькі спроб авалодаць заставай, але кожны раз іх атакі атрымлівалі моцны адпор савецкіх пагранічнікаў. Толькі тады праціўнік мусіў падцягнуць гармату і павёў артылерыйскі абстрэл памежных умацаванняў.

Сем атак вытрымала 3-я застава, пакуль пад гарматнымі ўдарамі не пачалі разбурацца абарончыя пабудовы і не сталі з'яўляцца чалавечыя ахвяры – загінулі кулямётчыкі,

былі цяжка паранены іншыя байцы. Сам лейтэнант В. Усаў атрымаў некалькі раненняў.

– Паводле адной з версій, Віктар Усаў, загадаўшы эвакуіраваць параненых, застаўся на перадавой і павёў у атаку ацалелых байцоў, – гаворыць А. Вашкевіч. – Паводле іншай, атака не была ажыццёўлена. У той час, калі лейтэнант падабраў снайперскую вінтоўку загінуўшага радавога Сарокіна, яго напаткала варожая куля. Яна патрапіла дваццаціпяцігадоваму кіраўніку заставы ў скроню. Снарад, што разарваўся ў гэты ж момант, абваліў краі траншэі, і В. Усаў быў засыпаны зямлёй. Камандаванне тымі, хто застаўся ў жывых, прыняў палітрук А. Шарыпаў. Яны і працягвалі бой, пакуль не з'явіўся з камендатуры салдат, які прынёс загад адступаць на Гродна.

Больш за шэсць гадзін пратрымалася застава, стрымліваючы ворага, які разлічваў справіцца з ёй за паўгадзіны. З акружэння, прабіўшы заслону праціўніка штыкавой атакай, выйшлі толькі дзевяць байцоў легендарнай заставы лейтэнанта В. Усава...




Астанкі лейтэнанта В. Усава знайшлі ў той самай засыпанай разрывам снарада траншэі ў ліпені 1952 года і ўрачыста перапахавалі разам з целамі яшчэ пяці пагранічнікаў, якія загінулі ў тым памятным баі 22 чэрвеня 1941 года. У 1958 годзе імя героя было прысвоена заставе Гродзенскага пагранічнага атрада, якая і цяпер дыслацыруецца на месцы колішняй 3-й лінейнай заставы 86-га Аўгустоўскага пагранатрада. У 1964 годзе вёска Вулька Даргунская была перайменавана ў Усава, а яшчэ праз год легендарнаму лейтэнанту В. Усаву было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

## Ніхто не хацеў паміраць

Трагічны лёс напаткаў і іншых пагранічнікаў, якія цаной уласнага жыцця стрымлівалі ворага ў ваколіцах Гродна. Прынамсі, надзвычай зацяты бой вялі байцы 1-й заставы 86-га Аўгустоўскага пагранатрада на чале са старшым лейтэнантам Аляксандрам Сівачовым, што дыслацыравалася каля вёскі Галавенчыцы цяперашняга Гродзенскага раёна. Амаль 11 гадзін доўжылася іх змаганне з ворагам, пры гэтым былі падбіты тры танкі і знішчана больш за 60 салдат праціўніка. Урэшце пагранічнікаў бамбардзіравалі і, мяркуючы, што ўсе абаронцы загінулі, фашысты накіраваліся на заставу ва ўвесь рост. Але пагранічнікі зноў сустрэлі іх шквальным агнём і прымусілі адступіць. Нягледзячы на раненне, А. Сівачоў працягваў кіраваць падначаленымі. Аднак вораг быў настойлівы ў сваіх памкненнях захапіць заставу. Пасля артылерыйскага абстрэлу пагранічнікаў атакавалі 8 танкаў – у іх паляцелі гранаты, але сілы аказаліся няроўнымі. Усе абаронцы заставы А. Сівачова загінулі, так і не пакінуўшы сваіх пазіцый.

Пасля вайны намаганнямі новага пакалення пагранічнікаў была ўвекавечана памяць герояў 1-й заставы. Каля вёскі Галавенчыцы яны ўстанавілі помнік з надпісам: «Тут пахаваны гераічныя абаронцы савецкай дзяржаўнай мяжы, якія загінулі смерцю храбрых у няроўным баі з фашысцкімі захопнікамі 22 чэрвеня 1941 года». У 1968 годзе 4-й заставе Гродзенскага пагранатрада было прысвоена імя Аляксандра Сівачова.

Пра тое, як змагаліся з ворагам каля вёскі Даргунь Гродзенскага раёна байцы 4-й заставы 86-га Аўгустоўскага пагранатрада, пакінуў свае ўспаміны ўжо вядомы нам Г. Здорны: «4-ю погранзаставу возглавлял старший лейтенант Ф.П. Кириченко. Сразу же после артобстрела немцы бросили на заставу батальон пехоты. В бой с ними вступил вначале наряд в составе красноармейцев Колоколова и Карельского, находившихся у самой границы. Вскоре в неравном бою Карельский был убит, а Колоколов сражался, пока не израсходовал все 120 патронов своего боекомплекта и обе гранаты, и лишь после этого присоединился к заставе. Наступавших фашистов пограничники подпустили на близкое расстояние и по команде старшего лейтенанта Кириченко открыли по ним огонь. Тогда гитлеровцы попытались обойти заставу по лесу. Начальник заставы разгадал их маневр и выдвинул на опушку леса группу бойцов с командиром отделения Обойщиковым. Внезапный огонь заставил немцев откатиться назад. Многократно атаковали фашисты заставу, но всякий раз их встречал меткий огонь пограничников. Несли потери и защитники заставы. Кончались боеприпасы, помощь к заставе не поступала, а уже завершался десятый час войны. К вечеру поступил приказ отойти. С боем вырвались пограничники из окруже-

6/16

ния. В этой последней схватке у своей заставы погиб старший лейтенант Ф.П. Кириченко…». У 2003 годзе 2-й заставе Гродзенскага пагранатрада Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі было прысвоена імя Феадосія Кірычэнкі.

У поўным акружэнні, без усялякай надзеі на падмогу змагаліся з наступаючым ворагам і байцы 2-й заставы 86-га Аўгустоўскага атрада, якой камандаваў малодшы лейтэнант Канстанцін Васільеў. Лёс абаронцаў, як і абставіны іх процістаяння фашыстам, да канца так і не высветлены. Дакладна вядома толькі, што пагранічнікі на чале з К. Васільевым вялі бой паміж вёскай Чарток і гарадскім пасёлкам Сапоцкін з танкавай калонай праціўніка, у якім, як мяркуецца, усе яны і загінулі. На жаль, відавочцаў таго няроўнага процістаяння знайсці нават у хуткім часе пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны не ўдалося. Аднак у 2006 годзе на месцы таго бою быў устаноўлены мемарыяльны знак.

Усе гэтыя, як і многія іншыя, прыклады самаадданага выканання пагранічнікамі свайго абавязку па ахове дзяржаўнай мяжы пацвярджаюць, што ў першыя гадзіны вайны яны рабілі ўсё магчымае, каб стрымаць ворага. І іх намаганні былі не дарэмныя. Дзякуючы адвазе і гераізму савецкіх пагранічнікаў праціўнік затрымаўся на мяжы на значна большы час, чым планаваў. Гэта ў пэўнай меры дало магчымасць сканцэнтраваць дзеянні вайсковых падраздзяленняў па наладжванні адпору ворагу. Прынамсі, у ваколіцах Гродна зрабіць гэта належала 68-му ўмацаванаму раёну. Аднак расказ пра гераізм і трагедыю яго абаронцаў – ужо іншая тэма.

## Памяць абавязвае

На вялікі жаль, пакуль яшчэ не ўстаноўлены імёны ўсіх герояў-пагранічнікаў, якія не шкадавалі свайго жыцця, упарта змагаючыся 22 чэрвеня 1941 года з ворагам на савецка-германскай мяжы. Як расказвае А. Вашкевіч, у свой час вялізную пошукавую работу правёў доктар гістарычных навук Уладзімір Верхась. На падставе архіўных даных, успамінаў ветэранаў і жыхароў памежных населеных пунктаў ён устанавіў каля 14 тыс. прозвішчаў байцоў і афіцэраў Беларускай пагранічнай акругі, якія загінулі ў няроўным змаганні з гітлераўцамі. Усе яны



▲ «Граніца» – мемарыял воінам-пагранічнікам, якія першымі сустрэлі войскі германскага вермахта раніцай 22 чэрвеня 1941 года, адкрыты 22 чэрвеня 2004 года ў Гродне. Камандзір, палітрук і чырвонаармеец – тры байцы, якія закрываюць пралом у сімвалічнай мяжы. Вакол – 15 слупоў былой граніцы СССР, што сімвалізуюць сабой савецкія рэспублікі. Гэты мемарыяльны комплекс называюць народным не толькі з-за яго значнасці, але і таму, што грошы на яго ўзвядзенне збіралі ўсёй грамадою.

затым увайшлі ў адмыслова выдадзеную кнігу «Память. Белорусский пограничный округ».

Памятаюць пра абаронцаў мяжы ў далёкім 1941-м і іх сучасныя пераемнікі. Як адзначылі ў прэс-службе Гродзенскай пагранічнай групы, практычна на ўсіх заставах існуюць пакоі баявой славы, дзе сабраны матэрыялы пра гераізм ахоўнікаў мяжы і прадстаўлены экспанаты – рэальныя сведкі прыгранічных баёў 22 чэрвеня 1941 года. З асабовым складам пагранзастаў праводзіцца вялікая работа па патрыятычным выхаванні, ладзяцца сустрэчы з ветэранамі пагранічнай службы. Арганізаваным экскурсіям выдаецца дазвол на наведванне некаторых застаў, найперш тых, што названы ў гонар В. Усава, Ф. Кірычэнкі, А. Сівачова.

Пры развітанні мой экскурсавод і вельмі кампетэнтны суразмоўца А. Вашкевіч падзяліўся навіной. Літаральна днямі ў адным са старых будынкаў, размешчаных каля шлюза «Дамброўка» папулярнага ў водных падарожнікаў Аўгустоўскага канала, ініцыятывай і стараннямі супрацоўнікаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея пры падтрымцы мясцовых улад быў адкрыты музей. Яго экспазіцыя расказвае пра гісторыю канала: сярод шматлікіх яе старонак ёсць і прысвечаныя пагранічным падзеям 22 чэрвеня 1941 года…

**Сяргей ГАЛОЎКА**

**Мінск – Гродна – Мінск**